Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Базавая школа №5 г. Калінкавічы»

# Максім Багдановіч. Верш “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…”
# 8 клас

Шахнова Ганна Мікалаеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі

2022

**Тэма:** Максім Багдановіч. Верш “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…”

**Мэта**: мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні:
будуць ведаць: паняцце пейзажная лірыка, ідэйна- мастацкі змест верша;
будуць умець: заўважаць паэтычную адухоўленасць з’ яў прыроды.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў**: стварыць умовы для выхавання пачуцця патрэбы ў кантактах з прыродай, беражлівыя адносіны да яе, садзейнічаць развіццю ўменняў вучняў аналізаваць, параўноўваць, выказваць і аргументаваць асабістую думку, вызначаць у вершы мастацкія тропы і разумець іх ролю ў стварэнні карцін прыроды.

**Абсталяванне:** партрэт Максіма Багдановіча, выстава кніг паэта, рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў, відэафрагмент да ўрока https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php, тэст да ўрыўка з паэмы Я. Коласа “Сымон- музыка” “О, край родны, край прыгожы!..” https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/13.php, воблака слоў да верша М. Багдановіча “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…”, блок-схема з выкарыстаннем “метада гексаў”, накцюрн Фрэдэрыка Шапэна https://www.youtube.com/watch?v=jShImBvjgQM, карта самаацэнкі

**Эпіграф:** “З прыродай зліўшыся душой…” (М.Багдановіч)

Ход урока

I.Арыенціровачна- матывацыйны этап

1.1.Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

Прырода – гэта самая лепшая з кніг, напісаная на асаблівай мове. Гэту мову трэба вывучаць.

Беларускія і замежныя мастакі, кампазітары, паэты стварылі і ствараюць вялікую колькасць цудоўных вершаў, карцін, музычных твораў, у якіх адлюстраваюць прыроду ў розныя поры года, выказваюць сваё імкненне вывучаць яе і захапляцца ёю.

Вы пагадзіцеся са мною, што сузіранне гармоніі ў прыродзе дае чалавеку адпачынак, душэўны спакой. Прырода прыгожая і цікавая барвова-залатой восенню, сцюдзёна-белай зімой, квяціста-зялёнай вясной і пяшчотна-цёплым летам.

Якая ваша любімая пара года, чаму? Што ў гэты час вам асабліва падабаецца ў прыродзе? ( *адказы вучняў* )

1.2.Актуалізацыя раней вывучанага. Праверка дамашняга задання.

1.2.1.Суаднясіце сцвярджэнні ў дачыненні да наступных паняццяў *( на дошцы змешчаны паняцці і сцвярджэнні) . Дадатак 1*

1.2.2.Выразнае чытанне ўрыўка “О, край родны, край прыгожы!” (з паэмы “Сымон-музыка” Я.Коласа)

1.2.3. Пытанні

Якімі вобразна- выяуленчымі сродкамі карыстаецца Я.Колас ва ўрыуку? Прывядзіце прыклады і вызначце іх ролю.*(адказы вучняў)*

(эпітэт, параунанне, інверсія, метафара)

1.2.4.Тэст да ўрыўка з паэмы Я. Коласа "Сымон- музыка" " О, край родны, край прыгожы!.." https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/13.php *(узаемаправерка)*

1.3.Мэтавызначэнне *(вучні самастойна фармулююць мэтыўрока, запісваюць у свае сшыткі, працягнуўшы выразы:*

даведаюся…

вызначу…

пашыру…

II. Пазнавальны этап

2.Праца над тэмай урока

2.1.Слова настаўніка.

Паважаныя вучні, звярніце ўвагу на партрэт вядомага класіка беларускай літаратуры М.Багдановіча, а таксама на выставу яго кніг. Многія творы вядомага беларускага класіка вы ўжо ведаеце. Давайце ўспомнім, з якімі творамі вы пазнаёміліся ў мінулых класах *(адказы вучняў).*

Прапаную вам прагледзець відэафрагмент урока, узнавіць веды пра творчасць М.Багдановіча, а таксама пазнаёміцца з яго вершам "Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…" https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php

2.1.1 Знаёмства з творчасцю класіка беларускай літаратуры М.Багдановіча https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php

2.1.2 Чытанне ўрыукаў з вывучаных раней твораў М.Багдановіча вучнямі https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php(3 вучні)

2.1.3 Выразнае чытанне верша М.Багдановіча "Ціхі вечар, цёплы вечар, свежы стог…" (аўтар відэафрагмента) https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php

2.1.4.Тлумачэнне сэнсу незразумелых слоў

*Усцяж*-па ўсёй прасторы, ва ўсіх напрамках,скрозь, уздоуж.

*Скрыдламі*- крыламі

*Знічка*-зорка, якая падае, коціцца па небе і знікае.

2.1.5 Выразнае чытанне верша вучнямі ( стар.83-84)*( 2-3 вучні)*

2.1.4 Аналіз першанага ўспрыняцця твора

Якія вобразы і малюнкі ўзніклі ў вашым уяўленні пры слуханні верша

*( адказы вучняў)*

Прагледзьце воблака слоў. Сярод іх знайдзіце тыя словы, якіясустрэліся ў вершы. *(работа у парах) Дадатак 2*

Цяпер прапаную вам параўнаць верш М.Багдановіча “Ціхі вечар, цёплы вечар, свежы стог…” з жывапіснымі карцінамі вядомых беларкскіх мастакоў. Знайдзіце сярод карцін тую , якая перадае настрой верша. *Дадатак 3*

Якія фарбы пераважаюць на карціне? *( адказы вучняў)*

2.1.5 Аналітычная гутарка *(выкананне заданняў у сшытку, самаправерка)*

1) Суаднясенне выдзеленых у вершаваных радках слоў з адпаведнымі тэрмінамі (вызначэнне мастацкіх троп). https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php

2) Суаднясенне вершаваных радкоў з адпаведнымі прыкладамі алітарацыі https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php

2.1.5 Фізкультхвілінка

У музыцы існуе жанр накцюрна – начной песні. Паслухайце, калі ласка, накцюрн Фрэдэрыка Шапэна. Уявіце сябе на месцы лірычнага героя верша, уявіце, што вы знаходзіцеся цёплым вечарам за вёскай. https://www.youtube.com/watch?v=jShImBvjgQM

Ці ўдалося пры дапамозе накцюрна зразумець пачуцці М.Багдановіча?
Якія зрокавыя вобразы ўзніклі пасля праслухоўвання?
Ці дапамагае музыка ўбачыць малюнкі роднага краю?

2.1.7 Ідывідуальная работа

Запоўніце выніковую блок- схему. Звярніце увагу на наступныя паказчыкі. *Дадатак 4*

2.1.8 Праца над эпіграфам.

Звярніце ўвагу на эпіграф да ўрока. Як вы разумееце словы Максіма Багдановіча?*( адказы вучняў)*

III. Кантрольна- карэкцыйны этап

3.1.Творчасць

Здаецца, што сёння на ўроку мы таксама, як і М.Багдановіч, “з прыродай зліліся душою…” Давайце складзём сінквейн, каб яшчэ раз упэўніцца ў тым, што прырода Беларусі найпрыгажыйшая ва ўсім свеце. *(работа ў групах)*

3.2 Тэст да верша М.Багдановіча “Ціхі вечар, цёплы вечар, свежы стог…” https://eior.by/catalog_lecture/8-klass/bellit/14.php *( узаемаправерка)*

IV. Дамашняе заданне

На дом вы атрымаеце індывідуальнае заданне падрыхтаваць кадраплан па вершы М.Багдановіча “Ціхі вечар, цёплы вечар” ў выглядзе малюнкаў. У нас павінен атрымацца нібы кінафільм з кароткіх кадраў па зместу верша. Кожнаму з вас трэба вусна вобразна і маляўніча апісаць свой кадр. Кожнае апісанне павінна пачынацца словамі: ”Вы бачыце…”

А цяпер уявіце , што вы кампазітар. Вам трэба ахарактарызаваць мелодыю, якую б вы выбралі б  для агучвання кадраў вашага фільма–верша? ( *Вясёлую, павольную, ціхую, урачыстую, з выкарыстаннем гукаў прыроды: спеў птушак, плёскатанне раўчука, шэлест лістоты…)*

V. Падвядзенне вынікаў урока.  Выстаўленне адзнак. Рэфлексія.

А зараз ацаніце кожны сам сябе, падлічыўшы балы, якія вы атрымалі пры выкананні заданняў.*( вучні самі ацэньваюць сябе) Дадатак 5*

Працягніце, калі ласка, выразы:

Сёння на ўроку я зразумеў…

Пасля урока мне захацелася… *(агучваюцца вынікі работы)*

*Дадатак 1*

| | |
|---|---|
| Лірычны герой | Вершы пра Радзіму, яе гісторыю, народ. |
| Пейзажная лірыка | Вершы пра сэнс чалавечака жыцця. |
| Філасофская лірыка | Вершы пра каханне, сяброўства, узаемаадносіны. |
| Інтымная лірыка | Абагульнены вобраз, які ўзнікае  ў думках чытача пасля прачытання верша і аб'ядноўвае ў сабе рысы, уласцівыя многім людзям. |
| Грамадзянская лірыка | Вершы пра прыроду |

*Дадатак 2*



*Дадатак 3*



Вітольд Бялыніцкі-Біруля «Вясна»



Павел Масленікаў «Летні дзень»



Эдуард Рымаровіч «Пачатак лістапада»



Станіслаў  Жукоўскі «Узыход месяца»

*Дадатак 4*



*Дадатак 5*

Карта самаацэнкі ___________________________________________

| Заданне | Максімальная колькасць балаў | Колькасць набраных балаў |
| --- | --- | --- |
| Дамашняе заданне. Урывак “О, край родны, край прыгожы!” (з паэмы “Сымон-музыка” Я.Коласа) ( вызначэнне мастацкіх троп) | 4 | |
| Тэст .Урывак “О, край родны, край прыгожы!” (з паэмы “Сымон-музыка” Я.Коласа) | 10 | |
| Воблака слоў. Верш М.Багдановіча “Ціхі вечар, цёплы вечар, свежы стог…” | 5 | |
| Праца з мастацкім творам | 2 | |
| Вызначэнне мастацкіх троп | 4 | |
| Суаднясенне вершаваных радкоў з адпаведнымі прыкладамі алітарацыі | 4 | |
| Блок- схема | 6 | |
| Тэст. Верш М.Багдановіча “Ціхі вечар, цёплы вечар, свежы стог…” | 10 | |
| Творчае заданне ( сінквейн) | 10 | |

<table>
<tr><td colspan="3">Выразнае чытанне верша, адказы на пытанні настаўніка</td><td colspan="3">5</td><td colspan="3"></td></tr>
<tr><td colspan="3">Усяго</td><td colspan="3">60</td><td colspan="3"></td></tr>
<tr><td>60-10</td><td>54-9</td><td>48-8</td><td>42-6</td><td>36-6</td><td>30-5</td><td>24-4</td><td>18-3</td><td>12-2</td></tr>
</table>